# Нацыянальны сцяг як галоўны палітычны сімвал

УДК 32.001



**Іван ТУРЛАЙ, кандыдат эканамічных навук, дацэнт**

Іван ТУРЛАЙ. Нацыянальны сцяг як галоўны палітычны сімвал. У артыкуле даследуецца пытанне ўзнікнення і выкарыстання дзяржаўных сцягоў як сімвалаў адзінства нацыі, звязаных з найважнейшымі палітычнымі падзеямі і працэсамі, а таксама як сакральных сімвалаў, акружаных асаблівым культам; як сімвалаў, якія з часам набываюць устойлівасць у адносінах да альтэрнатыўных сімвалаў шэрагу палітычных груп. Асаблівая ўвага ў гэтым кантэксце звернута да беларускага нацыянальнага сцяга.
Ключавыя словы: палітычны сімвал, нацыя, нацыянальны сцяг, альтэрнатыўны сцяг, беларускі нацыянальны сцяг.

Ivan TURLAI. National flag as the main political symbol. The article examines the emergence and use of national flags as symbols of national unity associated with the most important political events and processes and as sacred symbols surrounded by a special cult; as symbols that over time acquire stability in relation to alternative symbols of a number of political groups. In this context, the author pays special attention to the Belarusian national flag.
Keywords: political symbol, nation, national flag, alternative flag, Belarusian national flag.

Нацыянальны сцяг займае асаблівае месца ў шэрагу іншых палітычных сімвалаў. Як адзначае даследчыца нацыянальных сцягоў Г. Элгеніус, вызначэнне нацыі як супольнасці людзей падразумявае ў тым ліку наяўнасць прыхільнасці агульным сімвалам, галоўным з якіх з'яўляецца нацыянальны сцяг. Ён стаў найважнейшым палітычным сімвалам дзякуючы таму, што ў простай, абстрактнай форме рэпрэзентуе нацыю і дзяржаўнасць *[1, p. 28]*.

Паняцце «нацыянальны сцяг» з'яўляецца тварэннем эпохі Вялікай Французскай рэвалюцыі: да гэтага часу дзяржавамі свету выкарыстоўваліся толькі ваенныя або марскія сцягі, якія былі звязаны з манархіяй і з яе ўзброенымі сіламі. І толькі з канца XVIII стагоддзя з распаўсюджваннем ідэй нацыі і нацыянальнай дзяржавы сцягі сталі набываць інклюзіўнае, аб'ядноўваючае значэнне, якое асацыюецца з усімі грамадзянамі,



## ПРА АЎТАРА

ТУРЛАЙ Іван Сяргеевіч.

Нарадзіўся ў 1985 годзе ў г. Мінску. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (БДУ) (2008). Стажыраваўся на курсах Акадэміі дыпламатычнай службы МЗС ФРГ (2009). Дактарант кафедры міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (палітычныя навукі).

У 2008–2013 гадах – на дыпламатычнай службе Рэспублікі Беларусь. У 2014–2019 гадах – дацэнт кафедры міжнароднага менеджменту БДУ. З 2019 года – дацэнт кафедры кіравання і эканомікі вышэйшай школы Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы.

Кандыдат эканамічных навук (2013), дацэнт (2017).

Аўтар звыш 70 навуковых і навукова-папулярных работ, 11 кніг.

Сфера навуковых інтарэсаў: палітычныя інстытуты, інтэграцыя на постсавецкай прасторы, замежныя інвестыцыі, сацыяльна-эканамічнае развіццё Мінска, беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця.

а не толькі з кіруючымі элітамі *[2, p. 560]*. Так, у 1794 годзе быў зацверджаны французскі нацыянальны сцяг-трыкалор, пераважная ж большасць нацыянальных сцягоў была створана ў XIX і XX стагоддзях. Разам з тым некаторыя краіны, напрыклад Данія, Англія, Швейцарыя, Швецыя, Нідэрланды, Расія і іншыя, у якасці нацыянальных перанялі гістарычныя ваенныя або марскія сцягі.

Паходжанне нацыянальных сцягоў непарыўна звязана з палітычным кантэкстам, з найважнейшымі палітычнымі падзеямі і працэсамі – войнамі, рэвалюцыямі, дасягненнямі незалежнасці, грамадска-палітычнымі пераўтварэннямі, зменамі формы дзяржаўнага ладу і т. п. Напрыклад, трансфармацыя крыжовых сцягоў Даніі, Англіі, Швецыі, якія выкарыстоўваліся ў данацыянальную эпоху і першапачаткова з'яўляліся ваеннымі сімваламі, у нацыянальныя сцягі была звязана з працэсамі Рэфармацыі, пасля таго, як у гэтых краінах былі створаны пратэстанцкія цэрквы, якія не залежалі ад улады рымскага папы і падпарадкоўваліся непасрэдна сваім манархам. У сваю чаргу, шматлікія сцягі-трыкалоры адносяцца да эпохі фарміравання першых нацый і ўзніклі як сімвалы нацыянальнага рэвалюцыйнага і вызваленчага руху. Яшчэ адна група нацыянальных сцягоў – так званыя геральдычныя, створаныя з выкарыстаннем гістарычных элементаў – геральдычных колераў, эмблем, асаблівых сімвалаў, што адлюстроўваюць іх адметнасць. Гэтыя сцягі ўласцівы для эпохі постімперскіх нацый, якая пачалася пасля 1914 года, і былі зацверджаны ў сувязі з дасягненнем краінамі і народамі сваёй дзяржаўнай самастойнасці *[1, p. 51–54, 87–89]*.

Прырода нацыянальных сцягоў носіць дваісты характар: з аднаго боку, іх можна назваць сучаснай вынаходкай чалавецтва, з другога – звычайна іх звязваюць з усёй гісторыяй краіны, успрымаюць як архаічныя прадметы, якія маюць сакральную сутнасць *[2, p. 571]*. Нацыянальныя сцягі часта акружаны культам, да іх ставяцца з асаблівай павагай і пакланеннем. Існуюць адмысловыя правілы ўстаноўкі і вывешвання нацыянальных сцягоў, іх выкарыстання пры правядзенні розных цырымоній і мерапрыемстваў. Зневажанне нацыянальнага сцяга можа быць расцэнена як дзеянне па дэсакралізацыі галоўнага нацыянальнага сімвала, як абраза самой нацыі, і таму ў многіх краінах гэта разглядаецца як злачынства, якое вядзе да крымінальнай адказнасці.

Нягледзячы на тое што нацыянальны сцяг мае сакральнае значэнне і закліканы аб'ядноўваць усю нацыю, у многіх краінах існуюць пэўныя палітычныя групы, якія выкарыстоўваюць альтэрнатыўныя сцягі як сімвал адпаведных палітычных поглядаў і ідэалогіі. Яны таксама з'яўляюцца своеасаблівым інструментам барацьбы за ўладу *[3, с. 389]*. Так, у Расіі прыхільнікі манархічных і радыкальна-нацыяналістычных ідэй аб'ядноўваюцца пад чорна-жоўта-белым сцягам Расійскай імперыі, які афіцыйна выкарыстоўваўся ў дзяржаве з 1858 па 1896 год. У Германіі сцяг прыхільнікаў права-экстрэмісцкіх ідэй – чорна-бела-чырвоны трыкалор, ён з'яўляўся афіцыйным сцягам Германскай імперыі з 1871 па 1918 год, а таксама адным з афіцыйных сцягоў нацысцкай Германіі (разам са сцягам, які змяшчае свастыку) з 1933 па 1935 год. У ЗША прыхільнікі ідэі гонару паўднёвых штатаў, а таксама ідэі расізму выкарыстоўваюць сцяг Канфедэратыўных Штатаў Амерыкі 1863–1865 гадоў – сіні Андрэеўскі крыж з зоркамі на чырвоным полі. У Іспаніі праціўнікі манархічнай формы кіравання выкарыстоўваюць чырвона-жоўта-пурпурны трыкалор Іспанскай рэспублікі, што існавала з 1931 па 1939 год.

Варта адзначыць, што прыхільнікі пэўных палітычных ідэй у тых ці іншых краінах нярэдка лічаць сцягі сваіх партый ці аб'яднанняў сапраўднымі нацыянальнымі сімваламі, нягледзячы на тое што ў краіне ёсць дзейны афіцыйна зацверджаны сцяг. Афіцыйным жа прыпісваецца характарыстыка штучных сімвалаў. У сувязі з гэтым можна прывесці выказванне даследчыка нацыябудаўніцтва П. Колста, які адзначае, што натуральных нацыянальных сцягоў, як гэткіх, па сваёй прыродзе не існуе. Усе нацыянальныя сцягі ў нейкай ступені з'яўляюцца штучнымі, таму што на раннім этапе сваёй гісторыі здаваліся новымі і незнаёмымі. Паколькі ні ў адным нацыянальным сцягу першапачаткова няма прыроджаных якасцяў, што эмацыйна ці кагнітыўна злучаюць яго з нацыяй, якую ён сімвалізуе, то гэтай сувязі, відавочна, неабходна вучыцца. І ў гэтым плане фактар часу выконвае важную ролю: паступова альтэрнатыўныя сімвалы будуць выходзіць

за межы грамадскага ўспрымання, а дзейныя нацыянальныя сімвалы набудуць дастатковую ўстойлівасць, што будзе сведчыць аб згуртаванасці нацыі *[4, p. 696–698]*. Пры гэтым вялікую ролю ў фарміраванні такой устойлівасці адыгрываюць станоўчыя эмоцыі, звязаныя з нацыянальным сцягам, такія як гонар, радасць, прыўзняты настрой. Іх могуць выклікаць, напрыклад, перамога айчынных спартсменаў на міжнародных спаборніцтвах, правядзенне важных міжнародных сустрэч і самітаў з удзелам прадстаўнікоў сваёй краіны, паспяховае пазіцыянаванне і прасоўванне нацыянальнай прадукцыі за мяжой, правядзенне ўрачыстых і культурна-відовішчных мерапрыемстваў з выкарыстаннем нацыянальнага сцяга і г. д.

Разгледжаныя пытанні ўзнікнення і выкарыстання нацыянальных сцягоў маюць асаблівую актуальнасць для Беларусі на фоне падзей 2020 года, калі прадстаўнікі экстрэмісцкіх палітычных поглядаў у чарговы раз імкнуліся прадэманстраваць сваю сімволіку.

У кантэксце гэтых пытанняў звернемся да гісторыі беларускага нацыянальнага сцяга, вылучыўшы наступныя этапы яго эвалюцыі, якія звязаны з пэўнымі палітычнымі падзеямі.

Так, першым этапам эвалюцыі нацыянальнага сцяга можна лічыць этап, які звязаны з такімі значнымі падзеямі, як Кастрычніцкая рэвалюцыя, утварэнне першай беларускай нацыянальнай дзяржавы – Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, аб'яднанне БССР з Расійскай СФСР, Украінскай ССР і Закаўказскай СФСР у саюзную дзяржаву – Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Гэтыя падзеі абумовілі знешні выгляд беларускага сцяга, які выкарыстоўваўся з 1919 па 1951 год: ён уяўляў чырвонае палотнішча, у верхнім левым рагу якога размяшчаўся выкананы залатымі літарамі надпіс з найменнем рэспублікі, пасля дапоўнены эмблемамі Савецкай дзяржавы – перакрыжаванымі сярпом і молатам залатога колеру і пяціканцовай чырвонай зоркай, абрамленай залатым шлякам.

**Плошча Дзяржаўнага сцяга ў Мінску**



Другі этап эвалюцыі нацыянальнага сцяга звязаны з такімі падзеямі, як перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, утварэнне Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, уключэнне ў лік дзяржаў – заснавальніц ААН Беларускай ССР як краіны, якая панесла значныя страты ў вайне і ўнесла вялікі ўклад у разгром фашызму. Гэтыя падзеі паўплывалі на тое, што ў 1951 годзе быў зацверджаны новы Дзяржаўны сцяг БССР, які выкарыстоўваўся да 1991 года. Захаваліся чырвоны колер у якасці асновы, а таксама перакрыжаваныя серп і молат і пяціканцовая зорка ў верхнім левым рагу. У кампазіцыю палотнішча былі ўведзены зялёная паласа і нацыянальны арнамент белага колеру на чырвоным полі.

Трэці этап эвалюцыі нацыянальнага сцяга звязаны з такімі падзеямі, як абвяшчэнне незалежнасці БССР і яе перайменаванне ў Рэспубліку Беларусь, распад СССР, утварэнне прэзідэнцкай рэспублікі. Гэтыя падзеі паўплывалі на зацвярджэнне сучаснага Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, прынятага ў 1995 годзе па выніках праведзенага рэспубліканскага рэферэндуму. Сама выява сцяга заснавана на знешнім выглядзе Дзяржаўнага сцяга БССР, прынятага ў 1951 годзе. З яго кампазіцыі былі выключаны сімвалы Савецкай дзяржавы – серп і молат і пяціканцовая зорка, а колеры нацыянальнага арнаменту прыведзены да арыгінальнага выгляду – арнамент чырвонага колеру на белым полі.

У цэлым, калі звярнуцца да разгледжанай вышэй класіфікацыі нацыянальных сцягоў, што дала Г. Элгеніус, то беларускі варта аднесці да групы геральдычных сцягоў, паколькі ён з'яўляецца сцягам постімперскай нацыі і змяшчае адметны нацыянальны элемент – арнамент. Размяшчэнне гэтага элемента на палотнішчы, як зазначае знаўца сцягоў В.М. Сапрыкаў, стала наватарскай ідэяй. «Традыцыйны арнамент не проста ўпрыгожванне, а свайго роду пісьменнасць, своеасаблівы код, які з дапамогай узораў перадае пэўны сэнс, – піша даследчык. – Такога роду арнаменты людзі ўжывалі здаўна, калі ў іх яшчэ не было пісьменства, а яны хацелі перадаваць урокі жыцця, назапашаны вопыт наступным пакаленням. І рабілі яны гэта з дапамогай арнаменту, якім вышывалі адзенне, упрыгожвалі дамы, збрую, зброю, прадметы быту – гаршкі, кубкі, куфэркі» *[5, с. 96–97]*. Такім чынам, уключэнне арнаменту ў кампазіцыю беларускага нацыянальнага сцяга можна назваць адлюстраваннем сувязі паміж пакаленнямі, паміж старажытнай і найноўшай гісторыяй Беларусі. Арнамент размешчаны на адносна сучасным паводле мерак гісторыі нацыянальным палотнішчы, але яго прысутнасць на сцягу сведчыць аб даўняй, багатай на падзеі мінуўшчыне беларускага народа, адлюстроўвае павагу да культурных традыцый краіны.

Беларускі нацыянальны сцяг, як і нацыянальныя сцягі многіх іншых краін, з'яўляецца сакральным сімвалам. Выступаючы падчас урачыстага рытуалу ўшаноўвання дзяржаўных сімвалаў у 2022 годзе, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі з гэтым адзначаў: «Сцяг і герб – сутнасць іх у тым, што ўвесь народ, усе мы павінны пакланяцца ім. Гэта, калі хочаце, свецкая ікона ў краіне» *[6]*. Законам «Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь» устаноўлена патрабаванне паважлівых адносін да дзяржаўнай сімволікі, вызначаны парадак яе выкарыстання. За зневажанне дзяржаўных сімвалаў прадугледжаны меры адказнасці ў адпаведнасці з Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь. Указам Прэзідэнта «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь» устаноўлена адмысловае дзяржаўнае свята – Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, які адзначаецца ў другую нядзелю мая. У цэнтральнай частцы Мінска створана ўрачыстая плошча Дзяржаўнага сцяга, на якой устаноўлены сямідзесяціметровы флагшток з самым вялікім палотнішчам у краіне плошчай 98 квадратных метраў і вагой 25 кілаграмаў.

Асаблівую каштоўнасць дзяржаўныя сімвалы, перш за ўсё нацыянальны сцяг, набываюць падчас гістарычных выпрабаванняў. Сведкамі апошняга з такіх усе мы былі ў 2020 годзе, калі радыкальна настроеная група людзей імкнулася ўцягнуць нашу краіну ў грамадскі хаос. З мэтай сваёй палітычнай барацьбы яны выкарыстоўвалі альтэрнатыўны сімвал – бела-чырвона-белы сцяг. Нагадаем, што гістарычна ён з'яўляўся афіцыйным сцягам Беларускай Народнай Рэспублікі, якая існавала ў 1918 годзе ва ўмовах нямецкай акупацыі і не стала рэальнай дзяржавай. У гады нацысцкай акупацыі БССР бчб-сцяг выкарыстоўваўся

беларускімі калабарацыяністамі як афіцыйна дазволены з боку акупацыйнай адміністрацыі сімвал. У 1991 годзе такі сцяг быў зацверджаны ў якасці дзяржаўнага сімвала на падставе рашэння Вярхоўнага Савета Беларусі. Гэта рашэнне было прынята пад ціскам радыкальна-нацыяналістычнай апазіцыі і без уліку апытання грамадскай думкі. Сцяг выкарыстоўваўся да 1995 года, пакуль не быў адменены па выніках рэспубліканскага рэферэндуму *[7, с. 58–60]*.

У 2020 годзе экстрэмісты зноў пра яго згадалі. Паводле матэрыялаў Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь, «бела-чырвона-белая сімволіка радыкальных беларускіх нацыяналістаў мэтанакіравана выкарыстоўвалася ў якасці штучна аб'яднаўчай і атаясамліваючай падчас масавых беспарадкаў» *[8, с. 140]*. У выніку ён стаў сімвалам пагрозы разбурэння беларускай дзяржавы, мірнага жыцця. Беларускі народ яшчэ больш згуртаваўся вакол свайго сапраўднага нацыянальнага сцяга – чырвона-зялёнага палотнішча з арнаментам. Варта адзначыць, што за мінулыя некалькі гадоў значнасць гэтага сімвала ў жыцці беларускага грамадства прыкметна павысілася. Дзякуючы прынятым папраўкам у заканадаўства стала дазволена выкарыстоўваць нацыянальны сцяг паўсюдна і пастаянна пры ўмове забеспячэння неабходнай да яго павагі *[9]*.

Пашырэнне магчымасцей і нагод выкарыстання нацыянальнага сцяга, узрастанне гонару за дзяржаўныя сімвалы ў сувязі з поспехамі і дасягненнямі роднай краіны – усё гэта разам, безумоўна, будзе садзейнічаць умацаванню нацыянальнага адзінства і беларускай дзяржаўнасці.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 23.05.2023 г.*

## [ СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ]

1. Elgenius, G. Symbols of Nations and Nationalism: Celebrating Nationhood / G. Elgenius. – Basingstoke: Palgrave Macmillan, 2011. – 232 p.
2. Jaskulowski, W. The Magic of the National Flag / W. Jaskulowski // Ethnic and Racial Studies. – 2016. – Vol. 39, № 4. – P. 557–573.
3. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці: вучэб. дапаможнік для студ. устаноў выш. адукацыі / І.А. Марзалюк [і інш.]; пад агул. рэд. І.А. Марзалюка. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2022. – 448 с.
4. Kolstø, P. National Symbols as Signs of Unity and Division / P. Kolstø // Ethnic and Racial Studies. – 2006. – Vol. 29, № 4. – P. 676–701.
5. Сапрыков, В. Рождение главных символов / В. Сапрыков // Союзное государство. – 2009. – № 10. – С. 92–97.
6. Лукашэнка назваў герб і сцяг свецкай іконай, якой павінен пакланяцца ўвесь народ [Электронны рэсурс] // Беларускае тэлеграфнае агенцтва. – Рэжым доступу: https://blr.belta.by/president/view/lukashenka-nazvau-gerb-i-stsjag-svetskaj-ikonaj-jakoj-pavinen-paklanjatstsa-uves-narod-114522-2022/. – Дата доступу: 07.04.2023.
7. Турлай, И.С. Политическая символика: глубинный смысл и осознанный выбор белорусов / И.С. Турлай // Беларуская думка. – 2022. – № 8. – С. 56–62.
8. Геноцид белорусского народа: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общ. ред. А.И. Шведа. – Минск: Беларусь, 2022. – 176 с.
9. Об изменении Закона Республики Беларусь «О государственных символах Республики Беларусь» [Электронный рецсурс]: Закон Республики Беларусь, 4 янв. 2021 г., № 83-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12100083&p1=1&p5=0. – Дата доступа: 07.04.2023.